# ВЕКТОРЫ БЕЛОРУССКО-КИТАЙСКОГО СОТРУДНИЧЕСТВА

УДК 347.157.1

**М. В. Губко**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, serezhenka_filonchik@mail.ru*

## ДА ПЫТАННЯ АБ ДЗЕЯЗДОЛЬНАСЦІ МАЛАЛЕТНІХ

У данным артыкуле разглядаюцца пытанні дзеяздольнасці непаўналетніх у Рэспубліцы Беларусь, асабліва ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў. Праводзіцца параўнальны аналіз заканадаўства замежных дзяржаў, у тым ліку ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Разглядаюцца розныя меркаванні навукоўцаў наконт дзеяздольнасці непаўналетніх. Прапануюцца шляхі ўдасканалення нацыянальнага заканадаўства ў вобласці права- і дзеяздольнасці малалетніх.

**Ключавыя словы:** грамадзянскае права; непаўналетнія; малалетнія; дзеяздольнасць; праваздольнасць; прававы статус непаўналетніх; праваздольнасць малалетніх; дзеяздольнасць малалетніх.

**M. V. Gubko**
*Educational Institution "Baranovichi State University", Baranovichi, the Republic of Belarus, serezhenka_filonchik@mail.ru*

## TO THE QUESTION OF THE LEGAL CAPACITY OF MINORS

This article examines the issues of legal capacity of minors in the Republic of Belarus, especially those under the age of fourteen. A comparative analysis of the legislation of foreign states, including the People's Republic of China, is being conducted. Various opinions of scientists regarding the legal capacity of minors are considered. Ways to improve the national legislation in the field of legal capacity of minors are being worked out.

**Key words:** civil law; minors; juveniles; capacity; capability; legal status of minors; capacity of minors; capability of minors.

© Губко М. В., 2024



Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Дзеяздольнасць — састаўная частка правасуб'ектнасці, якая ўяўляе сабою здольнасць грамадзяніна сваімі дзеяннямі набываць і ажыццяўляць грамадзянскія правы, ствараць для сябе грамадзянскія абавязкі і выконваць іх.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь дзеяздольнасць узнікае ў поўным аб'ёме з надыходам паўналецця, гэта значыць па дасягненні васямнаццацігадовага ўзросту [1].

Асобным пытаннем у праве з'яўляюцца непаўналетнія і іх прававы статус. Існуе шмат меркаванняў па пытанні іх дзеяздольнаці і ўзросту, яе атрымання ў адпаведных аб'ёмах.

**Асноўная частка.** Непаўналетнія, у сілу свайго ўзросту і развіцця, валодаюць няпоўным аб'ёмам дзеяздольнасці. Грамадзянскі Кодэкс Рэспублікі Беларусь рэгламентуе аб'ёмы дзеяздольнасці непаўналетніх і малалетніх у артыкулах 25 і 27 адпаведна.

Вывучыўшы змест артыкулаў, можна вылучыць факт таго, што заканадавец канкрэтна вызначыў узроставыя межы непаўналетніх: ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў, чаго нельга сказаць пра малалетніх, у якіх заканадаўча замацавана толькі верхняя мяжа узросту, да якога яны лічацца такімі і валодаюць значна абмежаваным аб'ёмам дзеяздольнасці.

Такім чынам, невядома, з якога ўзросту заканадавец прызнае ўзнікненне дзеяздольнасці ў малалетніх, ці ён надзяляе іх ёю з нараджэння.

Само пытанне дзеяздольнасці малалетніх з'яўляецца дыскусійным. Некаторыя аўтары лічаць непаўналетніх, не дасягнуўшых чатырнаццацігадовага ўзросту, цалкам недзеяздольнымі, іншыя надзяляюць іх частковай недзеяздольнасцю, трэція — часткова дзеяздольнымі [2].

У навуцы прысутнічаюць таксама і больш радыкальныя пункты погляду аб дзеяздольнасці малалетніх, так А. С. Іоффэ адносіць малалетніх разам з псіхічнахворымі да недзеяздольных [3, с. 120—121].

Заслугоўвае ўвагі меркаванне А. Г. Бельковай: «Калі разглядаць дзеяздольнасць як "грамадзянска-прававую свядомасць, здольнасць чалавека свядома выказваць сваю волю пры здзяйсненні юрыдычных здзелак і кіраваць сваімі ўчынкамі з уразуменнем іх наступстваў", то зразумелымі становяцца сумненні ў дачыненні яе наяўнасці ў малалетніх» [4, с. 79].



Репозиторий БарГУ

Складанасць для заканадаўчай рэгламентацыі і вывучэння катэгорыя дзеяздольнасці прадстаўляе ў сілу сацыяльнай няспеласці непаўналетняга, а таксама аднachасовага ўплыву на яго паводзіны сацыяльнага і псіхалагічнага фактараў; яго дзеяздольнасць валодае шэрагам асаблівасцяў [2].

На наш погляд, павінен быць усталяваны выразны парог узнікнення дзеяздольнасці малалетніх. Для вызначэння аптымальнага ўзросту звярнемся да заканадаўства Рэспублікі Беларусь і замежных краін.

У Кодэксе Рэспублікі Беларусь Аб шлюбе і сям'і няма канкрэтнага ўказання на шуканы намі ўзроставы цэнз, але некаторыя нормы надзяляюць меркаванне непаўналетніх, дасягнуўшых дзесяцігадовага ўзросту, юрыдычнай сілай, значэннем.

Напрыклад:

1. Змяненне прозвішча дзіцяці, якое дасягнула дзесяці гадоў, ва ўсіх выпадках робіцца з яго згоды, якая выяўляецца органамі апекі і апекавальніцтва (арт. 70).

2. Суд улічвае, хто з бацькоў праяўляе большы клопат і ўвагу да дзіцяці, узрост дзіцяці і прыхільнасць да кожнага з бацькоў, асабістыя якасці бацькоў, магчымасць стварэння належных матэрыяльна-бытавых умоў і маральна-псіхалагічнай атмасферы, забеспячэння належнага ўзроўню выхавання. Улік меркавання дзіцяці, якое дасягнула ўзросту дзесяці гадоў, абавязковы, за выключэннем выпадкаў, калі гэта супярэчыць яго інтарэсам (арт. 74).

3. У рашэнні суда ўказваюцца час, месца і парадак такіх зносін. Пры гэтым павінна ўлічвацца жаданне дзіцяці, якое дасягнула дзесяці гадоў (арт. 78).

4. Суд мае права адмовіць у задавальненні гэтых патрабаванняў, калі прыйдзе да высновы, што перадача дзіцяці бацькам не адпавядае інтарэсам дзіцяці. Пры гэтым суд улічвае працягласць знаходжання дзіцяці ў сям'і асоб, якія фактычна яго выхоўвалі, а таксама жаданне дзіцяці, якое дасягнула дзесяці гадоў (арт. 79).

5. У рашэнні органа апекі і апекавальніцтва ўказваюцца час, месца і парадак зносін з дзіцём бацькоў, пазбаўленых бацькоўскіх правоў. Пры гэтым павінна ўлічвацца жаданне дзіцяці, якое дасягнула дзесяці гадоў (арт.83) і г. д. [5].

Рэпазіторый БарДУ

У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі заканадавец бачыць дастатковым для пачатку засваення вучэбных праграм шасцігадовы ўзрост:

Прыём (залічэнне) асоб ва ўстанову адукацыі для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі ажыццяўляецца па дасягненні гэтымі асобамі на пачатак навучальнага года ўзросту шасці гадоў або па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы з больш позняга ўзросту. Па заяве аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы пры наяўнасці рашэння педагагічнага савета дапускаецца прыём (залічэнне) у І клас асобы, якой шэсць гадоў спаўняецца ў бягучым каляндарным годзе [6].

Зразумела, што дадзенае палажэнне нельга выкарыстоўваць як універсальны арыенцір, бо дадзеная норма носіць адносна дыспазітыўны характар (прыём асоб ва ўстанову адукацыі для засваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі ажыццяўляецца па дасягненні гэтымі асобамі на пачатак навучальнага года ўзросту шасці гадоў або па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняй асобы з больш позняга ўзросту).

Але ўлічваць гэтае палажэнне варта ў сілу таго, што заканадавец лічыць гатовым непаўналетняга да пачатку засваення навучальнай праграмы, навучання і адпаведна падрыхтоўкеі да жыцця ў грамадстве, здзяйснення юрыдычна значных дзеянняў, заключэння здзелак і інш.

Гэты ўзрост мы возьмем за ўмоўны мінімум, ніжэй за каторы будзем лічыць малалетніх недзеяздольнымі цалкам.

Далей, звернемся да заканадаўства замежных краін:

1. Грамадзянскі Кодэкс Кітайскай Народнай Рэспублікі (далей — КНР) у артыкуле 19 вызначае, што непаўналетнія ва ўзросце старэйшым за 8 гадоў з’яўляюцца асобамі з абмежаванай дзеяздольнасцю. Акрамя гэтага, артыкул 20 вызначае, што непаўналетнія ва ўзросце да 8 гадоў з’яўляюцца недзеяздольнымі.

Такім чынам, праводзячы аналогію паміж грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і КНР, з боку нацыянальнага заканадаўства, можна лічыць, што Грамадзянскі Кодэкс Кітайскай Народнай Рэспублікі прызнае непаўналетніх ва ўзросце ад 8 гадоў малалетнімі, а асоб маладзейшых за 8 гадоў прызнае недзеяздольнымі зусім [7].

Рэпазіторый БарДУ

2. Грамадзянскім Кодэксам Расійскай Федэрацыі малалетнімі з'яўляюцца асобы ва ўзросце ад шасці да чатырнаццаці гадоў. Асобы, не дасягнуўшыя чатырнаццацігадовага ўзросту, не валодаюць нават абмежаваным аб'ёмам дзеяздольнасці малалетніх, адпаведна з'яўляюцца недзеяздольнымі.

3. Згодна з французскім заканадаўствам, непаўналетнія ва ўзросце да васямнаццаці гадоў прызнаюцца цалкам недзеяздольнымі. Аднак, ужо з шаснаццаці гадоў непаўналетнія ў Францыі могуць самастойна заключаць здзелкі, напрыклад, заключаць працоўны дагавор, складаць тастамент на палову маёмасці і г. д., без пісьмовай згоды сваіх законных прадстаўнікоў [8].

На наш погляд, устанаўленне ніжняй мяжы ўзросту малалетніх не павінна супадаць з прапанаваным Кодэксам аб адукацыі ўзростам залічэння для засваення зместу адукацыйнай праграмы, у сілу таго, што гэта пачатак засваення, а не які-небудзь яго этап, у сілу чаго малалетнія не здольны свядома падыходзіць да розных прававых дзеянняў у выглядзе недастатковасці ў іх неабходнай інтэлектуальнай і эмацыянальнай сталасці, каб ажыццяўляць усвядомленыя юрыдычныя дзеянні, усведамляць значэнне сваіх дзеянняў і кіраваць імі і г. д.

Важкай прапановай будзе ўсталяваць ніжні парог у выглядзе дзевяцігадовага ўзросту, на этапе якога ўжо можна меркаваць аб магчымасці малалетніх ажыццяўляць дробныя бытавыя здзелкі і ўсведамляць іх значэнне.

Прапанова ўстанавіць у Грамадзянскім Кодэксе Рэспублікі Беларусь ніжні ўзроставы рубеж (6 гадоў), з якога малалетнія набываюць частковую дзеяздольнасць — як гэта зроблена ў Расійскай Федэрацыі, выказвалася В. Ф. Чыгіром, аднак І. В. Савіна адзначае, што гэтая прапанова ўяўляецца спрэчнай, паколькі большасць дзяцей з нармальным развіццём і да шасці гадоў здольны ажыццяўляць дробныя бытавыя здзелкі [2, с. 48].

Безумоўна, нельга не згадзіцца з гэтым меркаваннем, але на наш погляд, як раней адзначалася ў артыкуле, ажыццяўленне малалетнімі дробна бытавых зделак яшчэ не кажа аб іх свядомасці пры ажыццяўленні дадзеных здзелак. Такім чынам, улічваючы ўсё вышэйпералічанае, каб непаўналетнія ў сілу абмежавання сваіх правоў, прапануемых намі, мелі магчымасць падрыхтавацца да ажыццяўлення сваіх правоў, навучыцца ажыццяўляць рознага роду



Рэпазіторый БарДУ

юрыдычныя дзеянні, а галоўным чынам дробныя бытавыя здзелкі, прапануем пакінуць за імі права ажыццяўляць «накіраваныя здзелкі» — здзелкі па распараджэнні сродкамі, прадастаўленымі законным прадстаўніком або са згоды апошняга трэцяй асобай для пэўнай мэты або свабоднага распараджэння.

Таксама трэба адзначыць, калі заканадавец, устанавіўшы толькі верхнюю мяжу ўзросту малалетніх пазначыў, што дзеяздольнасць у аб'ёме, прадугледжаным артыкулам 27 Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь, узнікае з моманту нараджэння, то гэты факт трэба адлюстраваць у грамадзянскім заканадаўстве.

**Заключэнне.** Улічваючы ўсё вышэйпададзенае і, робячы падагульненне, мы прапануем выкласці артыкул 27 Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь наступным чынам:

«Дзеяздольнасць непаўналетніх ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў (малалетніх)»

1. За непаўналетніх ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў (малалетніх) здзелкі, за выключэннем указаных у пункце 2 гэтага артыкула, могуць ажыццяўляць ад іх імені толькі іх законныя прадстаўнікі — бацькі, усынаўляльнікі або апекуны. Да здзелак законных прадстаўнікоў такога непаўналетняга з яго маёмасцю прымяняюцца правілы, прадугледжаныя пунктамі 2 і 3 артыкула 35 гэтага Кодэкса, калі іншае не ўстаноўлена Жыллёвым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

2. Непаўналетнія ва ўзросце ад дзевяці да чатырнаццаці гадоў маюць права самастойна ажыццяўляць:

1) дробныя бытавыя здзелкі;

2) здзелкі, накіраваныя на безаплатнае атрыманне выгад, якія не патрабуюць натарыяльнага сведчання або дзяржаўнай рэгістрацыі;

3) здзелкі па распараджэнні сродкамі, прадастаўленымі законным прадстаўніком або са згоды апошняга трэцяй асобай для пэўнай мэты або свабоднага распараджэння.

Асобы, не дасягнуўшыя дзевяцігадовага ўзросту, з'яўляюцца недзеяздольнымі, усе значныя юрыдычныя дзеянні і здзелкі ад іх імя і ў іх інтарэсах ажыццяўляюць іх законныя прадстаўнікі — бацькі, усынаўляльнікі або апекуны, за выключэннем здзелак па распараджэнні сродкамі, прадастаўленымі законным прадстаўніком або са згоды апошняга трэцяй асобай для пэўнай мэты або свабоднага распараджэння.

Рэпазіторый БарДУ

У сувязі са змяненнем артыкула 27 і ўстанаўленнем межаў узросту малалетніх, мэтазгодна было б адлюстраваць адсутнасць дзеяздольнасці ў асоб, не дасягнуўшых гэтага ўзросту.

Так, мы прапануем дапоўніць артыкул 20 Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь наступнымі палажэннямі:

1. Асобы ва ўзросце ад чатырнаццаці да васямнаццаці гадоў з'яўляюцца непаўналетнімі і валодаюць дзеяздольнасцю, прадугледжанай артыкулам 25 Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь;

2. Асобы ва ўзростце ад дзевяці да чатырнаццаці гадоў з'яўляюцца малалетнімі і валодаюць дзеяздольнасцю, прадугледжанай артыкулам 27 Грамадзянскага Кодэкса Рэспублікі Беларусь;

3. Асобы, не дасягнуўшыя дзевяцігадовага ўзросту, з'яўляюцца недзеяздольнымі, усе значныя юрыдычныя дзеянні і здзелкі ад іх імя і ў іх інтарэсах ажыццяўляюць іх законныя прадстаўнікі — бацькі, усынаўляльнікі або апекуны, за выключэннем здзелак, указаных у пункце 2 артыкула 27 Грамадзянскага Кодэска Рэспублікі Беларусь.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Гражданский кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 7 дек. 1998 г., № 218-З : принят Палатой Представителей 28 окт. 1998 г. : одобр. Советом Респ. 19 нояб. 1998 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 3 янв. 2023 г. № 240-З // ЭТАЛОН. Законодательство Респ.Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2024.

2. *Савина, И. В.* Правоспособность и дееспособность несовершеннолетних [Электронный ресурс] / И. В. Савина // ООО «Юрспектр». — Режим доступа: http://www.urspectr.info . — Дата доступа: 20.01.2024.

3. *Иоффе, О. С.* Вопросы теории права / О. С. Иоффе. — М. : Гос. изд-во юр. лит., 1961. — 381 с.

4. *Белькова, Е. Г.* Проблемы гражданской правосубъектности физических лиц / Е. Г. Белькова. — Иркутск : Изд-во БГУЭП, 2007. — 137 с.

5. Кодекс Республики Беларусь о браке и семье [Электронный ресурс] : 9 июля 1999 г., № 278-З : Принят Палатой представителей 3 июня 1999 г. : одобр. Советом Респ. 24 июня 1999 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 17 июля 2023 г. № 300-З // Нац. правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 25.07.2023, 2/3020.

6. Кодекс Республики Беларусь об образовании [Электронный ресурс] : 13 янв. 2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 декабря 2010 г. : одобр. Советом Респ. 22 дек. 2010 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 14 янв. 2022 г. № 154-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243 . — Дата доступа: 20.01.2024.


Репозиторий БарГУ

7. Грамадзянскі кодэкс Кітайскай Народнай Рэспублікі ад 28 мая 2020 г. [Электронный ресурс]. — Рэжым доступу: http://english.www.gov.cn/archive/-lawsregulations/202012/31/content_WS5fedad98c6d0f72576943005.html . — Дата доступу: 28.02.2024.

8. *Ляшко, А. А.* Сравнительная характеристика содержания дееспособности физических лиц в Республике Беларусь и зарубежных странах / А. А. Ляшко // Лучшая студ. ст. 2017 : сб. науч. ст. победителей V Междунар. науч.-практ. конкурса, 2017 г. — Пенза : Наука и Просвещение, 2017. — С. 253—256.

УДК 33

**Я. Е. Гулевич[1], М. М. Хованская[2]**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь, [1]milky3021@gmail.com, [2]machulj@tut.by*

# РЕЗУЛЬТАТИВНОСТЬ КРУПНЕЙШИХ БЕЛОРУССКО-КИТАЙСКИХ ПРОЕКТОВ НА ТЕРРИТОРИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Беларусь и Китай поддерживают тесные экономические отношения, осуществляя ряд совместных проектов на территории Беларуси. История сотрудничества между Беларусью и Китаем насчитывает множество значимых проектов в различных сферах. У Беларуси и Китая имеется большое количество проектов в различных отраслях экономики. Изучение результативности этих проектов является ключевым для оценки влияния китайско-белорусского сотрудничества на экономику и социальную сферу Беларуси.

**Ключевые слова:** Великий камень; инновации; инвестиции; технологии; БелДжи; БНБК.

**Y. E. Gulevich[1], M. M. Hovanskaya[2]**
*Institution of Education “Baranavichy State University”, Baranavichy, the Republic of Belarus, [1]milky3021@gmail.com, [2]machulj@tut.by*

# THE EFFECTIVENESS OF THE LARGEST BELARUSIAN-CHINESE PROJECTS ON THE TERRITORY OF THE REPUBLIC OF BELARUS

Belarus and China maintain close economic relations, implementing a number of joint projects on the territory of Belarus. The history of cooperation between Belarus

© Гулевич Я. Е., Хованская М. М., 2024

Репозиторий БарГУ